УДК 821.161.09

**Т.М. Пятроўская**
(Гомель, Беларусь)

# МАДЭЛЬ ЗНАЧНАГА ДАРОСЛАГА Ў СУЧАСНЫХ ПАДЛЕТКАВЫХ ТВОРАХ

*У артыкуле разглядаецца паняцце падлеткавай літаратуры, погляды на яе межы і асаблівасці. Таксама аналізуецца паняцце значнага дарослага, адрозненні яго вобраза ў савецкай літратуры і ў сучаснай. На прыкладзе трох сучасных твораў паказаны дарослыя героі ў падлеткавай літаратуры з мэтай вызначэння трансфармацыі функцыі значнага дарослага ў жыцці падлетка.*

Псіхолагі, апісваючы кожны ўзрост, звычайна вылучаюць новаўтварэнне пэўнага перыяду жыцця. У падлеткавым узросце такіх новаўтварэнняў – максімальная колькасць, а значыць, і літаратура для падлетка павінна адпавядаць тым маштабным зменам, якія адбываюцца ў яго псіхіцы. У практыцы выдавецтваў творы, прызначаныя для падлеткаў, пазначаюцца як “кнігі для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту”, гэта значыць ахопліваюць перыяд ад 11 да 18 гадоў. Такі вялікі часавы прамежак ускладняе вызначэнне паняцця “падлеткавая літаратура”. Аўтар “Гісторыі, крытыкі і дыдактыкі дзіцячай і юнацкай літаратуры ў грамадзянскую эпоху” М. Дарэндорф [1, с. 10] пры вызначэнні паняцця “дзіцячая і юнацкая літаратура” прыводзіць адрозненне паміж інтэнцыяльнай дзіцячай і юнацкай літаратурай як “напісанай і / або апублікаванай спецыяльна для дзяцей і юнацтва” і літаратурай, створанай не спецыяльна для дзяцей і юнацтва, аднак фактычна чытальнай дадзенай узроставай групай. Х. Эгерт і Ш. Гарбо трактуюць юнацкую літаратуру як “літаратуру, створаную адмыслова для такога перыяду развіцця, у якім чалавек вучыцца думаць абстрактна і дасягае палавой сталасці” [2, с. 73]. Аўтары прыходзяць да высновы аб тым, што вызначэнне паняцця юнацкай літаратуры з'яўляецца праблематычным. Яны таксама выкарыстоўваюць тэрмін “адалесцэнтная літаратура”, гэта значыць літаратура, у цэнтры якой адбываецца ператварэнне дзіцяці ў дарослага чалавека. Мы разумеем *падлеткавую літаратуру* як літаратуру, якая звяртаецца да праблем сучаснага падлетка, героем якой з’яўляецца падлетак і якая адпавядае выхаваўча-педагагічным задачам дадзенага ўзросту.

З кагнітыўнага боку для падлеткавай літаратуры характэрныя наступныя асаблівасці сюжэта:

1) Праблемны характар літаратуры. Падлеткавая мастацкая літаратура – гэта літаратура, якая дапамагае юным чытачам вырашаць праблемы ўласнай асобы і ўзаемадзеяння асобы з грамадствам, спрыяе сацыялізацыі асобы.

2) Зварот да адносін з прадстаўніком супрацьлеглага полу. Прынамсі, палавое паспяванне – гэта ўсё ж адно з самых галоўных новаўтварэнняў дадзенага ўзросту, таму адзначаная тэма з’яўляецца дастаткова папулярнай.

3) Наяўнасць атрыбутыкі сучаснага падлеткавага жыцця.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Эмацыянальна дадзеная літаратура ўключае ў сябе наступныя аспекты:

– Звычайна творы дадзенай катэгорыі пазбаўлены ацэначнасці і павучальнасці, увага скіравана на перажыванні галоўнага героя і яго адносіны, часта канфліктныя, з грамадствам.

– Эмпірычны характар атрымання новых ведаў. Адукацыя і вучоба ў падлеткавым жыцці рэзка губляюць свой аўтарытэт, фарміруецца лагічнае мысленне, якое патрабуе доказаў і эксперыментаў. Любая інфармацыя з’яўляецца даставернай толькі тады, калі яна атрымана ці самастойна праз уласны вопыт, ці з вопыту аднагодкаў.

Вобраз дарослага, як і вобраз дзіцяці, за апошняе стагоддзе змяніліся. На месца паслухмянага дзіця ці персанажа, якога ставяць на шлях выпраўлення, прыходзіць новы герой. Ён мае права на самавыражэнне, на розныя эмоцыі, на спрэчку з дарослым. Дарослы ж заканамерна губляе свой аўтарытэт, часам ён і сам разгублены. Атрымоўваецца, што замест жорсткіх межаў “дарослы-дзіцяці” прыходзіць змешванне роляў.

Ідэя даросласці як завершанасці першапачаткова забяспечвала аднаму з бацькоў, настаўніку, любому старэйшаму чалавеку дамінантную пазіцыю. Безумоўна, савецкая дзіцячая літаратура дапускала і негатыўныя вобразы дарослых, але яны ўспрымаліся хутчэй як адхіленне ад нормы, а дзіця магло разлічваць на падтрымку грамадства [3, с. 60]. Нароўні з мадэллю сям'і ў цэлым падвяргаюцца пераасэнсаванню і ўстойлівыя ролі кожнага з яе членаў. Вобразы маці або бацькі часта абвяргаюць традыцыйныя ўяўленні пра бацькоў, якія павінны выхоўваць дзіця з самага нараджэння, клапаціцца аб яго матэрыяльным і духоўным дабрабыце. Па назіранні Дж.Р. Таўнсенд, адной з самых прыкметных характарыстык дзіцячых раманаў апошніх дзесяцігоддзяў з’яўляецца наяўнасць бацькоў, якія “хутка коцяцца па нахільнай”, становячыся асноўнай праблемай у жыцці дзіцяці-пратаганіста [4, с. 332]. У знакамітым падлеткавым рамане “Над пропасцю ў жыце” дарослы свет супрацьпастаўлены свету падлетка, яго хаатычны, экспрэсіўны спосаб пазнання не стасуецца з упарадкаваным жыццём дарослых. У сучасным творы С. Крамер (аўтар-падлетак) “50 дзён да майго самагубства” галоўная гераіня таксама хаатычна шукае свой шлях, аднак вакол яе дарослыя знаходзяцца ў такіх жа алагічных пошуках. Адрозніваюцца дарослыя і дзеці толькі па сродках, якія выкарыстоўваюць яны ў гэтых пошуках.

Ключавым у гэтым даследаванні з’яўляецца паняцце «значнага дарослага», якое разглядаецца як прыватны выпадак паняцця “істотны іншы” (Significant Other), уведзенага амерыканскім сацыёлагам Г.С. Саліванам ў межах інтэрперсанальнай тэорыі. Пад “значным іншым” Г. Саліван разумее чалавека, меркаванне якога каштоўна для індывіда з пункту гледжання ўплыву на паводзіны апошняга, развіццё яго асобы і выбар каштоўнасных арыентацый [5, с. 165]. У дачыненні да падлетка такім значным могуць стаць як бацькі, так і настаўнікі ў школе, старэйшыя сябры. Каб апісаць новую мадэль значнага дарослага ў падлеткавай літаратуры, мы разгледзелі тры творы: “Сіямцы” Я. Пастарнак, Жвалеўскага, “Мая мілая ведзьма” В. Гапеева, “Апошні дзень лета” А. Масла. Творы для аналіза абраны невыпадкова.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усе аўтары з'яўляюцца на сённяшні дзень даволі ўплывовымі фігурамі ў дзіцячай літаратуры, іх творчасць максімальна запатрабавана з боку мэтавай чытацкай аўдыторыі. Наша мэта: прааналізаваць вобразы значнага дарослага ў творах, вызначыць формы ўзаемаадносін дзяцей і дарослых, іх трансфармацыю.

Усе тры творы аб'ядноўвае адна агульная рыса: падлеткі жывуць у атмасферы няпоўнай сям'і, прычым гэтая атмасфера непакоіць іх, робіць больш адзінокімі і самастойнымі. Галоўны герой твора "Мая мілая ведзьма" Кір спачувае сваёй маці: тая выхоўвае яго без бацькі. Тата ў свой час паехаў на заробкі ў Расію і не вярнуўся. Маці высветліла, што ў яго ўжо ёсць новая сям'я. На першы погляд адсутнасць бацькі не вельмі клапоціць падлетка: яны з маці прызвычаіліся жыць маленькай сям'ёй, да таго ж дзіцячыя ўспаміны хлопца пра бацьку ўтрымоўваюць не самыя лепшыя моманты. Аднак здараецца нечаканае. У клас Кіра прыходзіць незвычайная новенькая, якая згаджаецца пагадаць па руцэ хлопца:

– А ты адзіны ў сям'і. Вой, цябе так любіць твой бацька!

Я высмыкнуў рукі з яе далоні – рэзка, нават груба. Яна са спалохам глядзела на мяне.

– Выбачай, ведзьмы з цябе не атрымаецца, – насмешліва пачаў я [6, с. 26].

Словы Ядвісі ўсхвалявалі хлопца, нават пакрыўдзілі, і гэта ў сваю чаргу выдае яго пакрыўджанасць на ўласнага бацьку. У Ядвісі таксама няма бацькі, і менавіта Кір дапамагае знайсці яго і шчасліва аб'яднаць сям'ю. Кір шкадуе маці, ідзе купляць адзенне ў сэканхэнд, калі разумее, што грошай няма, і запэўнівае маці, што ў гэтым няма праблемы. У гераіні твора "Сіямцы" Геулы таксама няма бацькі, і яна жыве ў пэўным супрацоўніцтве з маці. У спрэчках з ёй дзяўчына выступае хутчэй як дарослая, а не падлетак, абвінавачваючы маці, што яна ўскладняе іх жыццё, стварае праблемы. Дарэчы, да бацькі ў Геулы такія ж адносіны, як і ў Кіра. Усё дзяцінства яна забараняе сабе думаць аб ім, аднак у самы адчайны момант жыцця яна спрабуе яго ўявіць, адшукаць яго сярод выпадковых прахожых. Абедзве маці ("Мая мілая ведзьма", "Сіямцы"), хоць і маюць пэўны аўтарытэт для дзяцей, але ўспрымаюцца самімі падлеткамі як слабыя, ад якіх можна чакаць паразумення, але не падтрымкі. Прычым не па прычыне таго, што яны на гэту падтрымку не здольныя, а таму што такім жанчынам самім патрэбна падтрымка. У Яна з аповесці "Сіямцы" ёсць і мама, і тата, якія прадстаўляюць класічную сям'ю. Бацька з'яўляецца аўтарытэтнай галавой сямейства, а маці – клапатлівай гаспадыняй, якая заведама займае пасіўную ролю. Часам гэта клапатлівасць і пакорнасць маці раздражняе Яна, бо яна таксама не прымаецца як падтрымка. Пры гэтым, калі інфантыльных мам падлеткі стараюцца абараніць, то мама-гаспадыня не заслугоўвае нават гэтага: яна заўсёды ўваходзіць не ў той момант, гаворыць не тыя словы, а яе пачуцці нікога не клапоцяць. У апавяданні А. Масла "Апошні дзень лета" падлетак аказваецца адзінокім, хаця мае шмат родных. Развод бацькоў мяняе жыццё маленькай Янкі, бо з-за яго ўся сям'я распадаецца на дзве часткі. Сярод вялікай колькасці радні знаходзіцца толькі адзін – дзед, які аказваецца дзяўчынцы блізкім, бо максімальна абстрагіруецца ад канфлікта ў сям'і. Але ён памірае. Дзяўчына трапляе ў сітуацыю, калі ёй фактычна забараняюцца кантакты з бацькамі таты, псуюцца ўзаемаадносіны з татам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праходзіць час, усе ўладкоўваюць сваё асабістае жыццё, нават бабуля знайшла сабе новага мужа, а дзяўчына так і застаецца адна, без значнага дарослага. Усе тры творы падобныя тым, што функцыю значнага дарослага на сябе бяруць аднагодкі герояў, яны фарміруюць іх маральныя каштоўнасці, дапамагаюць зрабіць выбар, падтрымліваюць. Так, у аповесці "Мая мілая ведзьма" падлеткі падтрымліваюць адзін аднаго, дапамагаюць іншым дарослым зрабіць рашучыя ўчынкі, мяняць сваё жыццё. У творы "Сіямцы" нават закладзена думка аб душэўнай сувязі двух падлеткаў, якія аддаляюцца адзін ад аднаго, аднак іх пастаянна яднае адзін з персанажаў твора – Мінск. У апавяданні "Апошні дзень лета" гераіня выпадкова сустракае хлопца, які распавядае сваю гісторыю ўзаемаадносін з бацькам. Як вынік Янка пасля гэтай сустрэчы тэлефануе бабулі па бацькавай лініі, каб сказаць, што любіць яе.

Такім чынам, у прааналізаваных творах назіраецца адмова ад аўтарытарнага вобраза дарослага. Вобраз значнага дарослага ўскладняецца, становіцца менш ідэальным. Бацькі вельмі часта інфантыльныя, засяроджаныя на сваіх пачуццях, а падлетак становіцца больш аўтаномным, здольным жыць сам па сабе, часам яму прыходзіцца яшчэ і вырашаць праблемы бацькоў. Пры гэтым нельга сказаць, што іншыя, аўтарытарныя бацькі маглі б стаць значнымі дарослымі, бо канцэпт улады на сучасных дзяцей уздзейнічае яшчэ горш, чым яго адсутнасць. Гэта даказваюць больш разнабаковыя вобразы настаўнікаў у творах. Так, падлеткі не ўспрымаюць аўтарытарнага па сваім стылі настаўніка гісторыі ў аповесці "Мая мілая ведзьма". Дзеянні завуча, які выступае як носьбіт улады ў школе, ў творы "Сіямцы" ўвогуле даводзіць да таго, што гераіня збягае са школы. Значнымі дарослымі сярод настаўнікаў становяцца педагогі, якія здольны на раўнапраўны дыялог, стыль жыцця якіх адпавядае іх канцэпцыі выхавання.

**Спіс літаратуры**

1. Привалова, Е.П. Культурная структура художественного текста для подростков [Текст] / Е.П. Привалова // Вестник Московского государственного лингвистического университета. – № 559. – 2009. – С. 143–148.

2. Сергоманов, П.А. К вопросу о ведущей деятельности в старшем школьном возрасте [Текст] / П.А. Сергоманов // Педагогика развития: соотношение учения и обучения : мат-лы 7-й науч.-практ. конф. Красноярск, 2000. – Ч. 1. – С. 45.

3. Балина, М. Литературная репрезентация детства в советской и постсоветской России / М. Балина // Детские чтения. – 2012. – Т. 1, № 1. С. 43–66.

4. Townsend, J. R. The Turbulent Years // Egoff, S., Stubbs, G., Ashley R. and Sutton, W. (eds) Only Connect: Reading on Children's Literature. – New York and Oxford : Oxford University Press, 1996. – P. 328–336.

5. Салливан, Г.С. Интерперсональная теория в психиатрии / Г.С. Салливан ; пер. с англ. – СПб. : Ювента, 1999. – 347 с.

6. Гапееў, В.М. Мая мілая ведзьма : школьны раман [Тэкст] / Валеры Гапееў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. – 254 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова